стихотворение является обращением к художнику, тут не третье, как в предыдущих текстах, а второе лицо:

Не Иегова, не Иисусе,
ах, Марк Захарович, нарисуйте
непобедимо синий завет –
Небом Единым Жив Человек.

Таким образом, мы видим, что в российской поэзии XX века картины Шагала не существуют отдельно от художника. Более того, в центре внимания гораздо чаще оказывается он сам, его жизнь, мысли, чувства, ви́дение мира – чем его картины как таковые. Подробные экфрастические описания отсутствуют, только упоминания отдельных деталей. Картины как таковые никогда не становятся центром лирического сюжета, только частью образной системы стихотворения. Образ самого Шагала находится в центре пространственных и временных оппозиций: тогда – прошлое, Витебск, движение, жизнь, разнообразие / сейчас – настоящее, Франция, память, ностальгия, тоска (будь того его – по Витебску, или наша – по нему). Локус Витебска становится сквозным мотивом, без его упоминания не обходится ни одно стихотворение. А самая часто упоминаемая картина – «Над городом» (1918), полет влюбленных над Витебском. Отсюда – постоянная вертикаль в организации пространства, мотивы памяти и движения. И отсюда же образы, пришедшие из картин Шагала – город, полет, еврейство. То есть получается, что обращение к образу Шагала в российской поэзии актуализирует не столько визуальную составляющую его картин как таковых, сколько их смысл и эмоциональный план, передаваемый через образ художника. В них описывается не то, что мы видим на его картинах, а то, что мы чувствуем, когда вглядываемся в них.

**Литература**


1. Вознесенский, А. «Ты меня никогда не забудешь..» / А. Вознесенский. – СПб. : Азбука, 2019. 384 с.
2. Городницкий, А. Мою маму зовут Рахиль : стихи и песни / А. Городницкий. – СПб. : [б.и.], 2020. – 256 .
3. Егоров, В. Шагал / Bards.ru : международный портал авторской песни [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.bards.ru/archives/part.php?id=52649. – Дата доступа : 20.02.2020.
4. Орлов, А. (Орлуша). Три художника. Часть вторая. Еврей / Орлуша. Поэзия. И не только [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://a-orlusha.ru/?p=123. – Дата доступа : 20.02.2020.
5. Рождественский, Р. Эхо любви : стихотворения, поэмы / Р. Рождественский. – М. : Э, 2017. – 608 с.



**V.Ya. Malkina**
Russian State University for the Humanities
e-mail: poetika@gmail.com


**Marc Chagall in Russian poetry of the XX century**


*Key words: visual in literature, lyrical plot, lyrical subject, lyrical image, poetry and painting*



*The article discusses the representation of the image of Marc Chagall in the verses of Russian poets of the twentieth century: R. Rozhdestvensky, V. Egorov, A. Gorodnitsky, A. Voznesensky and A. Orlov (Orlusha). At the center of the analysis is the problem of how visual art (painting) is embodied in lyric poetry, and how it relates the image of the artist and his paintings.*



**С.В. Мартынкевіч**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: svetlana_mrt@mail.ru



УДК 371.32-053.5:811.161.3’42


## МЕТАД МАДЭЛЯВАННЯ ТЭКСТУ Ў ЛІНГВАМЕТАДЫЧНАЙ СІСТЭМЕ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ


*Ключавыя словы: метад мадэлявання тэксту, развіццё маўлення, тэкст, прыметы тэксту, план тэксту, кампазіцыйная схема тэксту.*



*У артыкуле раскрываюцца дыдактычныя асновы выкарыстання метаду мадэлявання тэксту ў сістэме працы па развіцці звязага маўлення вучняў. Прапануецца пералік уменняў, якія фарміруюцца пры рабоце з маўленчымі паняццямі, разглядаюцца віды дзейнасці пры стварэнні тэкстаў творчых прац.*


У сучаснай лінгвадыдактыцы тэкст з’яўляецца асноўнай адзінкай навучання. Ён выкарыстоўваецца як кантэкст для дэманстрацыі функцыі моўных з’яў, як матэрыял для назірання і аналізу пры вызначэнні іх сутнасці і характэрных прымет. Да таго ж, тэкст нясе інфармацыю пра культуру народа, яго нацыянальныя асаблівасці, маральныя нормы і каштоўнасці.. Ён з’яўляецца прадуктам маўленчай дзейнасці, таму ўменне ствараць тэксты ў адпаведнасці з мэтамі камунікацыі адносіцца да асноўных уменняў, якія фарміруюцца ў працэсе авалодання мовай. У лінгваметадычнай сістэме працы мадэляванне тэксту з’яўляецца адным

з асноўных метадаў навучання маўленню, дзякуючы чаму адбываецца ўсведамленне законаў стварэння тэксту, пабудова ўласных маўленчых твораў як выніку матываванай і мэтанакіраванай вучэбнай дзейнасці.

Як вядома, асноўная адзінка суразмоўніцтва – выказванне. Яно характарызуецца “абавязковай уключанасцю ў маўленчую сітуацыю, без чаго як такое не існуе” [4, с. 53]. Інфармацыя пра сферы суразмоўніцтва, яго мэты закладзены ў тэксце. Аўтар стварае выказванне з пэўным намерам (інтэнцыяй) і ўлікам сітуацыі маўлення. Дасягненне мэты камунікацыі – зразумець суразмоўцу – залежыць ад таго, наколькі адрасат валодае ўменнямі вызначэння камунікатыўнага намеру і якаснай перапрацоўкі інфармацыі.

Такім чынам, для сучаснай лінгваметодыкі важным з’яўляецца разгляд тэксту як 1) адзінкі вышэйшага ўзроўню моўнай сістэмы, якая інтэгруе ўсе адзінкі мовы і вызначае іх функцыянаванне ў маўленні; 2) адзінку маўлення, якая з’яўляецца прадуктам маўленча-мысліцельнай дзейнасці і выступае пасрэднікам паміж камунікантамі ў працэсе суразмоўніцтва.

Разгледзім тэарэтычныя асновы мадэлявання тэксту ў сістэме працы па развіцці маўлення, прымаючы пад увагу вызначаныя вучэбнай праграмай віды творчых прац (сачыненняў) і патрабаванні да маўленчых ведаў і ўменняў вучняў.

У сувязі сашматаспектнасцю вывучэння тэксту ў вучэбную праграму ўключаны наступныя маўленчыя паняцці: прыметы тэксту (тэма, асноўная думка, цэласнасць, разгорнутасць, паслядоўнасць, кампазіцыйная завершанасць); функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўленння (апавяданне, апісанне, разважанне); функцыянальныя стылі маўлення (гутарковы, мастацкі, навуковы, афіцыйныі публіцыстычны); жанры маўлення.

Асноўныя прыметы тэксту разглядаюцца ў адзінстве яго прадметна-прагматычных характарыстык: *тэма* тэксту вывучаецца ў адпаведнасці з яго інфармацыйнасцю і камунікатыўнай функцыянальнасцю, *асноўная думка* – з камунікатыўным намерам (інтэнцыянальнасцю), *цэласнасць, разгорнутасць і паслядоўнасць* – у сувязі з лексіка-семантычным напаўненнем, сэнсавым адзінствам і лагічнасцю выкладу думкі; *завершанасць* – з дасягненнем мэты маўлення. У працэсе навучання матэрыял групуецца па раздзелах і тэмах, некаторыя звесткі падаюцца праз тлумачэнне, некаторыя – пры непасрэдным іх прымяненні – аналізе і стварэнні тэкстаў. Засваенне маўленчага матэрыялу накіравана на ўсведамленне *спосабаў маўленчай дзейнасці*, што спрыяе пераносу ўменняў і навыкаў на працэс стварэння выказвання. З улікам таго, што тэкст – гэта прадукт маўлення, яго катэгорыі немагчыма разглядаць адасоблена ад дзейнасці суразмоўцаў. З гэтага вынікае, што ўсе маўленчыя звесткі павінны засвойвацца на аснове паняцця *сітуацыя маўлення*.

Звесткі пра маўленчую сітуацыю прэзентуюцца як “сукупнасць умоў, маўленчых і немаўленчых, неабходных і дастатковых для таго, каб здзейсніць маўленчае дзеянне па вызначаным плане” [3, с. 155]. Таму для фарміравання ўменняў тэкстаўтварэння важна на аснове звестак пра сітуацыю маўлення *(адрасант, адрасат, месца, мэта, выказванне)* фарміраваць наступныя ўменні: *аднаўляць маўленчую сітуацыю, вызначаць яе афіцыйны / неафіцыйны характар; вызначаць задачу моўных зносін (паведамленне, уздзеянне, гутарка); вызначаць адпаведнасць моўных сродкаў абставінам і адрасату; даваць характарыстыку ўдзельнікам маўленчых зносін; прагназаваць вынікі суразмоўніцтва.*

Мадэляванне ўласных тэкстаў неабходна пачынаць з працы з гатовым тэкстам як узорам маўлення, у працэсе чаго развіваюцца ўменні *вызначаць тэму тэксту*; *разумець змест, вызначаць асноўную думку тэксту*; *даваць назву тэксту*; *вызначаць часткі тэксту* і *сэнсавыя адносіны паміж часткамі (прычыны, выніку, мэты, умовы)*; *вызначаць апорныя словы і сказы ў тэксце*; *вызначаць лексіка-граматычныя сродкі рэалізацыі задумы*; *знаходзіць сродкі сувязі сказаў у тэксце*; *вызначаць логіку разгортвання думкі*; *вызначаць, у якой ступені рэалізавана задума аўтара*.

Такім чынам, засваенне спецыяльных ведаў па тэорыі тэксту празразгляд асаблівасцей маўленчай сітуацыі спрыяе ўсведамленню таго, што тэкст – гэта прадукт маўленчай дзейнасці чалавека, а адбор моўных сродкаў для яго стварэння залежыць ад умоў маўлення.

Мадэляванне тэксту пачынаецца з асэнсавання прапанаванай тэмы выказвання. *Тэма* – прадметны змест, тое, пра што апавядаюць, разважаюць ціншто апісваецца. Пры распрацоўцы метаду мадэлявання тэкстаў могуць быць выкарыстаны ў той ці іншай ступені спосабы члянення тэмы згодна зраспрацаванымі ў методыцы развіцця маўлення прынцыпамі. *Прынцып разумення шматбаковасці тэмы і неабходнасці раскрываць розныя яе аспекты* выкарыстоўваецца пераважна пры мадэляванні тэкстаў на літаратурныя тэмы, дзе неабходна раскрыць ідэйна-мастацкае багацце вобраза, а таксама ў сачыненнях-апісаннях знешнасці чалавека, апісаннях прадметаў рэчаіснасці і інш. *Параўнальна-супастаўляльны прынцып* выкарыстоўваецца пры складанні плана ўласнага выказвання, у якім асноўны прыём раскрыцця тэмы – параўнальная характарыстыка па падабенству, па кантрасце і інш. *Супастаўляльны* прынцып дае магчымасць вылучыць адметнае, індывідуальнае, падкрэсліць тыя ці іншыя якасці прадмета думкі. *Падтэмны прынцып*

Рэпазіторый ВДУ

выкарыстоўваецца пры складанні плана сачынення, якое носіць аглядава-абагульняльны характар. *Паслядоўна-храналагічны прынцып* блізкі да падтэмнага і патрабуе падачу матэрыялу ў храналагічный паслядоўнасці.

Разглядаюцца *шырокая і вузкая*тэмы. Вузкая тэма можа быць сфармулявана як тэма-паняцце, тэма-пытанне, тэма-меркаванне. Яна павінна быць канкрэтнай, скіроўваць да адбору фактычнага матэрыялу. Тэма-*паняцце* толькі называе прадмет сачынення, не прадказваючы асноўны тэзіс і шлях яго разгортвання. Тэма-*пытанне* вызначае шлях да раскрыцця думкі: адказ на пытанне падводзіць да фармулёўкі тэзіса. Тэма-*меркавання* звычайна пададзена як гатовы тэзіс. Напрыклад: *Мая Радзіма – Беларусь* – шырокая тэма. Яна можа канкрэтызавацца любой з пералічаных вузкіх тэм:

*Каля карты Беларусі.*

*Гістарычныя мясціны роднага краю.*

*Мой родны горад: гісторыя і сучаснасць.*

Тэма экстралінгвістычная па сваёй сутнасці, хоць і выражаецца сродкамі мовы. Яна ахоплівае ўвесь змест выказвання і можа супадаць з загалоўкам. Суадносіны тэмы і зместу могуць мяняцца ў розных тыпах тэкстаў. Разам з тым у кожным выпадку ўспрыманне тэксту пачынаецца з загалоўка.

Складанне плана – наступны этап мадэлявання тэксту. План тэксту пэўным чынамрэалізуе тэму і галоўную думку тэксту, дапамагае спрагназаваць ідэйны змест, убачыць прычынна-выніковыя сувязі, прадказаць апісанне ходу падзей. У ім выкладаюцца папярэднія сціслыя звесткі адносна частак тэксту. Стварэнню ўласнага тэксту можа папярэднічаць складанне *плану-накіду,* які потым удакладняецца *цытатны м*або *складаным плану.* Для фармулёўкі назваў пунктаў плана неабходна знайсці найбольш дакладныя словы, якія перадаюць сэнс пэўнай часткі.

Напрыклад, прапануем планпа тэме творчай працы *Сапраўдны сябар... які ён?*, уключанай у вучэбную праграму 7-га класа:

1. *Чалавек без сяброў, што печ без дроў.*
2. *Няма грошай – не бяда, як сяброў грамада.*
3. *Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам.*
4. *Сябар не той, хто мёдам мажа, а той, хто праўду ў вочы кажа.*
5. *І службу служы, і сябру дапамажы.*
6. *Новых сяброў набывай, але і старых не забывай.*

Падбор эпіграфа звычайна скіроўвае ўвагу на асноўную думку сачынення і акрэслівае кірунак у раскрыцці тэмы. Эпіграф можа быць падабраны і пасля складання ўласнага тэксту (напісання сачынення), калі яго змест асэнсаваны.

Уступная частка рыхтуе да ўспрыняцця асноўнага зместу тэксту. Адсутнасць уступу парушае яго звязнасць. Засваенне характарыстык тэкставых уступаў з'яўляецца асноўнай умовай валодання механізмамі тэкстаўтварэння на яго пачатковым этапе. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца наступныя віды ўступаў: 1) фактуальны; 2) тэматычны; 3) канцэптуальны (гітарычны, гісторыка-літаратурны, праблемны, біяграфічны, параўнальны, лірычны). Фактуальны ўступ пачынаецца з паведамлення фактаў (што вядома, дзе першы раз убачыў, з чым можна параўнаць і інш.). У канцэптуальным фармулюецца асноўная думка тэксту; прыводзяцца цытаты, якія змяшчаюць галоўную думку. У тэматычным зачыне удакладняецца або дэталізуецца тэма загалоўка, акрэсліваецца прадмет абмеркавання.

Цытаванне – даслоўная вытрымка з тэксту, якая прыводзіцца для пацвяржэння, тлумачэння ці больш яркага выражэння сваіх думак. Функцыі цытат –інфарматыўная (знаёміць з аўтарытэтнай думкай), аргументуючая (пацвярджэнне сваіх уласных думак), экспрэсіўная (больш вобразнае выражэнне ўласнай думкі), тлумачальная (разгорнутае апісанне), ацэначная (для больш выразнай ацэнкі), адсылачная (для пашырэння інфармацыі). Цытаванне патрабуе падбіраць патрэбныя вытрымкі з тэкстаў, уключаць іх у адпаведнасці з логікай свайго выказвання. Цытаты ўзнаўляюцца дакладна, з захаваннем усіх асаблівасцей арыгінала, прыводзяцца без скажэння думкі.

Выніковы этап мадэлявання ўласных тэкстаў – афармленне іх у адпаведнасці са схемамі паводле пэўнага тыпу маўлення. Тэксты тыпу разважання будуюцца па наступнай схеме:

1. Уступ. Тэзіс-тлумачэнне выбару тэмы.
2. Асноўная частка. Поўная адпаведнасць выбранай тэме – абгрунтаванне, супрацьпастаўленне, супастаўленне, параўнанне, прыклады, доказы (аргументы, факты, цытаты), прамежкавыя вывады; апора на тэкст – прамое цытаванне, пераказ тэксту.
3. Заключэнне. Выніковае разважанне па тэме.

Прыкладная мадэль тэксту-апісання:

1. Уступ. Вызначэнне прадмета ці аб'екта апісання, абгрунтаванне.
2. Асноўная частка. Вызначэнне адрознівальных прымет (пры апісанні чалавека – партрэт, лад жыцця, учынкі, рысы характару, асноўны занятак і інш.; у прадметаў – памер, знешняе



Репозиторий ВГУ

апісанне, адрознівальныя асаблівасці, прызначэнне і інш.); уключэнне ў апісанне элементаў апавядання для пацвярджэння асноўных рыс, уласцівасцей прадмета, аб'екта.

3. Заключэнне. Вывад пра тое, для чаго рабілася апісанне, ці падабаецца прадмет, чаму.

Прыкладная мадэль тэксту тыпу апавядання.

1. Уступ. Вызначэнне часу, месца, дзейных асоб.
2. Асноўная частка: завязка дзеяння;развіццё дзеяння (паведамленне пра падзеі, якія адбыліся, з абавязковай кульмінацыяй, спадам напружанасці); канцоўка.
3. Заключэнне. Вывад пра тое, для чаго распавядалі пра гэтыяпадзеі.

Варта адзначыць, што "ўменне спалучаць розныя тыпы, уводзіць фрагменты іншых тыпаў у асноўны з'яўляецца неабходным для развіцця звязнага маўлення вучняў" [1, с. 11]. Такое ўменне запатрабавана не толькі пры стварэнні маналагічнага (звязнага) выказвання, але і ў дыялагічным маўленні. Рэальныя маўленчыя зносіны – гэта часцей за ўсё спалучэнне частак розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў. Таму ў працэсе мадэлявання тэкстаў неабходна весці аналітычную працу з узорамі змешанага тыпу, разглядаць сітуацыі маўлення, якія абгрунтоўваюць мэтазгоднасць спалучэння розных частак, што ў далейшым дазволіць дакладна прагназаваць структуру ўласнага тэксту.

Такім чынам, метад мадэлявання тэксту грунтуецца на тэкстацэнтрычным падыходзе, які вызначае асноўныя прыёмы працы, накіраваныя на стварэнне ўласных выказванняў.Пры засваенні маўленчых паняццяў у сістэму працы ўключаюцца заданні, распрацаваныя з улікам складнікаў сітуацыі маўлення, што прыводзіць да разумення залежнасці выніку маўленча-мысліцельнай дзейнасці суразмоўцаў ад іх камунікатыўнага намеру. Пры стварэнні вучнямі ўласных выказванняў увага засяроджваецца на сінтаксічным і структурным адзінстве тэксту, яго функцыянальна-сэнсавых асаблівасцях, што дапамагае зразумець правілы кампазіцыйнай арганізацыі тэксту, прыёмы выражэння інфармацыі. Чым больш асэнсавана будуць падыходзіць вучні да такога віду дзейнасці як аналіз і мадэляванне тэкстаў, тым больш трывала будуць замацоўвацца не толькі маўленчыя веды, але і разнастайныя моўныя адзінкі, якія забяспечваюць уменне весці суразмоўніцтва па-беларуску.

**Літаратура**

1. Валочка, Г.М. Лінгваметадычная сістэма развіцця звязнага маўлення школьнікаў пры навучанні беларускай мове : аўтарэф. дыс. ... д-ра пед. навук : 13.00.02 / Г.М. Валочка ; Нац. ін-т адукацыі. – Мінск, 2008.– 48 с.
2. Калганова, Т. А. Сочинения различных жанров в старших классах. -М.: Просвещение, 1997.
3. Леонтьев, А.А. Язык, речь, речевая деятельность / А.А. Леонтьев. – М. : Просвещение, 1969. – 241 с.
4. Ломов, А.М. Словарь-справочник по синтаксису современного русского языка / А.М. Ломов. – М. : АСТ: Восток – Запад, 2007. – 416 с.

**S.V. Martynkevich**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: svetlana_mrt@mail.ru

**Text modeling methodsin linguistic and methodological system of speech development**

*Key words: text modeling method, the development of speech, text, text distinctive features, text outline, compositional scheme of the text.*

*The article describes the basics of using the teaching method of text modeling while working on the development of students' speech.The list of skills that are formed while working with speech concepts is proposed, activities in creating compositions are considered.*

**И.Г. Минералова**
Московский педагогический государственный университет
e-mail: mig_mama@mail.ru

УДК 821.161.1

## ИСТОРИЧЕСКИЙ ФАКТ В ЛИТЕРАТУРНОМ ПРОИЗВЕДЕНИИ КАК АКСИОЛОГИЧЕСКИЙ ФЕНОМЕН

*Ключевые слова: исторический факт, образный строй, внутренняя форма, ценностные доминанты, парафразирование.*

*В статье представлены филологические подходы к осмыслению произведений поэзии и прозы, посвященных судьбоносным событиям отечественной истории. Демонстрируется особенная роль сравнительно-исторического метода, позволяющего системно изучать историю в формах, представленных в художественной словесности. Материалом работы избраны повести и стихи, посвященные Великой Отечественной войне, ее участникам и героям.*

Репозиторий ВГУ